№139 (7744), чацверг, 26 лістапада 2015 «Настаўніцкая газета»

# Складнікі прафесіяналізму

**Пошук эфектыўных напрамкаў і выпрацоўка сучасных падыходаў да прафарыентацыйнай работы сталі галоўнай тэмай абмеркавання падчас пасяджэння Савета кіраўнікоў устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі вобласці, якое адбылося на базе Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага каледжа.**



Да Савета кіраўнікоў далучыліся дырэктар Полацкага дзяржаўнага хіміка-тэхналагічнага каледжа Ганна Бурэнь (злева) і дырэктар Віцебскага дзяржаўнага прафесійна-тэхналагічнага каледжа Ірына Кісялёва.

— Спецыфіка і метадалогія прафарыентацыйнай работы ў кожнай установы прафесійнай адукацыі свае, кожны шукае свайго абітурыента, — зазначыў старшыня Савета кіраўнікоў дырэктар Віцебскага дзяржаўнага індустрыяльна-будаўнічага каледжа Аляксандр Ласякін. — Тым не менш агульнымі застаюцца прынцыпы фарміравання мэтавай аўдыторыі абітурыентаў, устойлівай матывацыі маладых людзей да атрымання канкрэтнай прафесіі. Калі гаварыць пра метады прафарыентацыі і прафагітацыі, то мы маем, без перабольшання, унікальны вопыт. Віцебскі дзяржаўны медыцынскі каледж па гэтым напрамку на працягу многіх гадоў уваходзіць у лік лідараў. Любое прафарыентацыйнае мерапрыемства праводзіцца бездакорна, пакідае ўражанне імправізацыі, але на самай справе ўсё да дробязей, да кожнай рэплікі ўдзельніка прадумана. Гэта паказчык вельмі высокага ўзроўню работы.

Напэўна, не менш важнай і запамінальнай часткай пасяджэння было выступленне дырэктара ўстановы — гаспадара мерапрыемства Валянціны Заяц. Праблемнае поле даклада яна акрэсліла наступным чынам: "Насустрач 100-гадоваму юбілею каледжа, новыя гістарычныя дакументы".

— Тэма нетыповая, аднак даволі актуальная, — пракаменціраваў Аляксандр Ласякін. — Сёлета пяць устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі вобласці адзначаюць юбілеі. Пры гэтым калектывы нярэдка сустракаюцца з праблемай арганізацыі ўрачыстасцей. Вопыт паказвае: немагчыма дастойна падрыхтавацца да юбілею за адзін месяц ці нават за некалькі — патрэбны гады карпатлівай працы. У медыцынскім каледжы мы паглядзелі, як трэба працаваць з гістарычнымі фактамі, з архівамі, каб гісторыя ўстановы адукацыі сапраўды ажыла, уступіла ў дыялог з сучасным пакаленнем, стала дзейсным інструментам прафагітацыі, фарміравання асобы грамадзяніна-патрыёта і высокакваліфікаванага спецыяліста.

З верасня да Савета кіраўнікоў далучыліся дырэктар Полацкага дзяржаўнага хіміка-тэхналагічнага каледжа Ганна Бурэнь і дырэктар Віцебскага дзяржаўнага прафесійна-тэхналагічнага каледжа Ірына Кісялёва.

— Мы рады папаўненню, — падзяліўся разважаннямі Аляксандр Ласякін. — Раней гэта былі прафесійна-тэхнічныя каледжы, якія не мелі магчымасці ажыццяўляць набор абітурыентаў адразу на ступень сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Цяпер яны выйшлі на якасна новы ўзровень. Гэта ўстановы адукацыі з высокім патэнцыялам, вялікім кантынгентам навучэнцаў і моцнымі працоўнымі калектывамі. Іх ведае не толькі Віцебшчына, але і ўся краіна. Нярэдка яны прадстаўляюць рэгіён на мерапрыемствах самага высокага ўзроўню. Упэўнены, што ў іх вялікая будучыня.

**Фота аўтара.**

**Таццяна БОНДАРАВА.**
*vitsebsk@ng-press.by*